СВАБОДА

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА

№ 25 (40), 19–25.10. 2006 г.

# ЧАРГА ДАЙШЛА ДА “АФГАНЦАЎ”

## “У ЧЫМ СІЛА, БРАТ? — СІЛА Ў ПРАЎДЗЕ”

Пасля зачысткі апазіцыйнага поля, дзе цяпер альбо сядзяць у турмах і ў эміграцыі, альбо спрачаюцца за лідэрства; пасля дэмаралізацыі недзяржаўнае прэсы, рэдактары якой просяць сёння найвышэйшага дазволу друкавацца і пашырацца ў Беларусі; пасля ліквідацыі прафсаюзнага руху і выгнання пісьменнікаў з Дому літаратараў, – адным словам, пасля таго, як былі сагнутыя самыя незгібальныя, змагар-прэзідэнт адчуў адзіноту і адсутнасць паўнаты жыцця, і перавёў свой позірк на тыя грамадскія групы, дзе быццам бы і не змагаюцца супраць яго, але ж маюць нахабства самастойна мысліць, выяўляць волю і вызнаваць веру. Пад каток рэпрэсіўнай сістэмы патрапіла пратэстанцкая царква “Новае жыццё”, пра што мы пісалі ў папярэднім нумары, а таксама... афганс-

Працяг на стар. 4




**Пікет у падтрымку** *маладога палітыка Змітра Дашкевіча, а таксама сваякоў зніклых — Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Юрыя Захаранкі, Змітра Завадскага. (Дашкевіча, якога ўтрымліваюць у папярэднім зняволенні, пачнуць судзіць 30 кастрычніка.) Мінск, Плошча Перамогі, 26 верасня 2006 году.*

## СМЕРЦЬ ФРАНКЕНШТЭЙНА

### СНД У КАМАТОЗНЫМ СТАНЕ

► СТАР.5

## ФІДЭЛІЗАЦЫЯ ЎЛАДЫ

### САПРАЎДНАГА ДЫКТАТАРА НАРОД ЛЮБІЦЬ

► СТАР.7

# ХТО СЁННЯ БАРОНІЦЬ ГОНАР БЕЛАРУСКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ?

**БАРЫС ПЯТРОВІЧ, ПІСЬМЕННІК:**

## “ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ ПАВІННА ЎМЕЦЬ БАРАНІЦЦА САМА”

Ніхто. Ніхто і не павінен бараніць. Інтэлігенцыя павінна ўмець бараніцца сама. Бо іначай яна не мазгі нацыі, а, як казаў адзін вядомы таварыш, “гаўно нацыі”. І яшчэ адзін расеец, паэт Станіслаў Куняеў, казаў, што дабро павінна быць з кулакамі. І вось пакуль інтэлігенцыя будзе чакаць, што яе нехта абароніць, знойдзецца той, хто ператворыць яе ў тое, пра што я казаў раней. А такое пытанне не павінна стаяць увогуле. Бараніцца трэба самому найперш, і тады ўдасца чаго-небудзь дабіцца.

**УЛАДЗІМІР, БІЗНЕСОВЕЦ:**

## “КОЖНЫ САМАСТОЙНА БАРОНІЦЬ СВІЙ ГОНАР”

Ніякай “інтэлігенцыі” не існуе. “Інтэлігенцыя” – гэта расійскі тэрмін пазамінулага стагоддзя, з дапамогай якога трэба было далучыць разначынцаў да кола прыстойных людзей. Што тычыцца Беларусі, прыстойных людзей, як групы, у нас не засталося ўвогуле. Ёсць асобныя прыстойныя людзі, якія свой гонар бароняць, а ёсць людзі, якія свой гонар прадалі за каўбасу і зарплату ў 200 даляраў. Калі пад інтэлігенцыяй разумець людзей, якія маюць гонар, людзей адукаваных, мыслячых… Іх не трэба абараняць. Яны могуць абараніць сябе самі. Кожны самастойна бароніць свой гонар. І ў годных людзей гэта вельмі годна атрымліваецца.

**РАДЗІМ ГАРЭЦКІ,**
**АКАДЭМІК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК:**

## “СТАНОВІШЧА НАШАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ НЕ КРЫТЫЧНАЕ”

Перш-наперш, пісьменнікі. Такія, як Бураўкін, Гілевіч, Законнікаў. Брыль да апошняга свайго дня… Яшчэ можна называць многіх. Мастакі ёсць. Я многіх магу назваць, хто абараняе гонар нашай краіны і інтэлігенцыі. Хаця вельмі многа ёсць людзей салідных і знакамітых, хто з-за страху згубіць сваё матэрыяльнае становішча, згубіў урэшце свой гонар. Іх не менш, а можа, нават, і больш. Але іх мне не хочацца называць. Ды становішча нашай інтэлігенцыі не крытычнае. Далёка не ўсе задралі лапкі ўверх і ляглі, ці прадаліся. Сярод навукоўцаў Акадэміі навук вельмі мала засталося людзей незламаных. Амаль няма. Але мяне радуе, што сярод моладзі ёсць годныя людзі. Нашае пакаленне адыходзіць, і важна, каб было каму перадаць свае ідэалы. Нягледзячы на жудасны сучасны стан, я ўсё ж аптымістычна гляджу на будучыню нашай нацыі.

**ВОЛЬГА, МУЗЫКА:**

## “ГОНАР ДАДЗЕНЫ ЧАЛАВЕКУ АД НАРАДЖЭННЯ”

Гонар, ён альбо ёсць, альбо яго няма. Яго не трэба асабліва гадаваць, акучваць. Ён існуе незалежна ад палітычных умоваў, нацыянальных адметнасцяў. Гонар гэта тое паняцце, якое мае дачыненне толькі да індывідуальнасьці, да асобы. Гонар дадзены ад нараджэння, ён перадаецца толькі генетычна, яго немагчыма выхаваць. І менавіта таму ён бароніць сябе сам. Таму што ён ёсць. “Гонар беларускай інтэлігенцыі” – гучыць таксама абсурдна, як, напрыклад, “далікатнасць беларускага народа”. Можна гаварыць толькі пра гонар канкрэтнага беларускага інтэлігента.

**СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ, ВЫКЛАДЧЫК:**

## “НАСТАЎНІКІ І КСЯНДЗЫ”

Персанальна ніхто. Бо сышла вялікая эпоха 19-га і 20-га стагоддзяў, калі лёс нацыяў залежаў ад персонаў. І харызма аднаго чалавека магла зрушваць народы. Свет стаў больш складаны, з’явіліся новыя камунікацыйныя сістэмы, спосабы перадачы інфармацыі. Таму спадзявацца і верыць у тое, што прыйдзе нехта, хто нам усё растлумачыць і раскажа, нейкі маральны аўтарытэт… Такім аўтарытэтам у нас быў Быкаў. Ягоная творчасць і ён сам цалкам належыць 20-му стагоддзю. Але мой досвед сёлетніх вандровак па Беларусі дае мне права сказаць, што гонар беларускай інтэлігенцыі сёння ратуюць настаўнікі і ксяндзы. Калі гаварыць пра ксяндзоў, я маю на ўвазе Ўсходнюю Беларусь, Магілёўшчыну і Гомельшчыну. Толькі рымска-каталіцкія святары трымаюцца там беларушчыны, беларускай мовы. Як у набажэнствах так і па-за сценамі храмаў. Гэта не можа не выклікаць павагі. І ў кожным раёне ёсць два-тры настаўнікі, краязнаўцы, якія ведаюць цану беларускаму слову і намагаюцца перадаць свае веды дзецям. Настаўнікі і святары ратуюць гонар інтэлігенцыі.

**СЯМЁН, НАСТАЎНІК:**

## “АБАРОНА БЕЛАРУШЧЫНЫ ЁСЦЬ ЧЫНАМ У АБАРОНУ ГОНАРУ”

Паняцце “інтэлігенцыя” неадрыўнае ад паняцця “гонару”. Таму гонар беларускай інтэлігенцыі сёння бароніць кожны беларускі інтэлігент. Ці то настаўнік, які выходзіць за межы падручніка, ці то пісьменнік, які піша, “як дыша”, ці то кіроўца тралейбуса, які аб’яўляе прыпынкі па-беларуску. Любы ўчынак у абарону беларушчыны ёсць чынам у абарону нацыянальнага гонару. Шкада, што беларускай інтэлігенцыі вельмі мала на сённяшні дзень.

**ВАСІЛІНА, СТУДЭНТКА:**

## “ТВОРЦЫ, ЯКІЯ ЗАСТАЛІСЯ ВЕРНЫМІ СВАІМ ПРЫНЦЫПАМ”

Напэўна, тыя нешматлікія творцы, якія складаюць касцяк інтэлігенцыі. Пісьменнікі, мастакі, музыкі, якія засталіся вернымі свайму сцягу, сваім прынцыпам. І не баяцца гэта дэманстраваць у сваёй творчасці і жыцці. Чым і заслугоўваюць павагу астатніх людзей.

**ГЕНАДЗЬ САГАНОВІЧ, ГІСТОРЫК:**

## “А ЦІ ЁСЦЬ ЯШЧЭ ШТО БАРАНІЦЬ?”

Пасля ўсяго, што адбылося ў Беларусі, пачынаючы ад 1994-га, не можа не паўставаць пытанне: “А ці ёсць яшчэ што бараніць?” Бо калі нашая супольнасць мела дастаткова гонару, каб быць сапраўднай інтэлігенцыяй, то яна мусіла б агульным рухам рэагаваць на тыя здзекі, што чыніліся з беларускай культуры цягам апошняга дзесяцігоддзя. Інтэлігенцыя не магла б цярпець тыя ганьбы. І цяпер добра, каля пякучы сорам злучыць нас у адно цэлае. І дай Божа, каб кожны здолеў бараніць свой гонар.

# ПРАЦЯГВАЕЦЦА ГАЛАДОЎКА-ПОСТ



*"Працягваецца галадоўка-пост вернікаў пратэстанцкай царквы "Новае жыццё". Прыхаджане пратэстуюць супраць спробаў улады забраць у іх храм. На 21 кастрычніка прызначаны мітынг пратэсту на плошчы Бангалор. Мінскія ўлады далі дазвол на яго правядзенне. Разам з тым, на дзяржаўным канале СТВ быў паказаны сюжэт, паводле якога жыццю вернікаў пагражае небяспека, бо ў будынку, дзе яны галадуюць, нібыта, можа ў любы момант успыхнуць пажар.* ***Мінск, 13 кастрычніка 2006 году.***

# ПРАЦАЎНІКІ "БЕЛШЫНЫ" ВЫЗНАЧЫЛІ ДЗЕНЬ МАСАВАЙ ГАЛАДОЎКІ

*Ад 3 кастрычніка ў Бабруйску трымае галадоўку сябра Беларускага незалежнага прафсаюза (БНП), электрык адкрытага акцыянернага таварыства "Белшына" Алена Захожая.*

Старшыня Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) Аляксандр Ярашук паведаміў, што яшчэ пяцёра працаўнікоў "Белшыны" ў чацвер, 19 кастрычніка далучацца да акцыі пратэсту Алены Захожай.

Паводле Аляксандра Ярашука, міжнародныя прафсаюзныя арганізацыі і нацыянальныя прафсаюзныя цэнтры Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы дасылаюць тэлеграмы й лісты падтрымкі Алене Захожай.

Адміністрацыя "Белшыны" адмаўляецца ад траўня 2006 году выплаціць сябрам БНП прэміі і грашовыя даплаты да адпачынку. Акрамя таго, кіраўніцтва прадпрыемства ігнаруе просьбы БНП аб вызначэнні юрыдычнага адрасу. Без яго першасная арганізацыя незалежнага прафсаюзу не можа зарэгістравацца ў мясцовых органах улады.

**Паводле Радыё Свабода**

# ТОЛЬКІ BELARUS'!

9—13 кастрычніка ў Таліне адбылася канферэнцыя, якая сабрала разам экспертаў ААН па тапаніміцы (напісанні геаграфічных назваў) з Эстоніі, Латвіі, Літвы, Расіі, Алжыра, Ізраіля, Францыі, Вялікабрытаніі і ЗША. Па выніках канферэнцыі было прынятае рашэнне аб тым, што беларускія тапонімы ў лацінскім шрыфце будуць захоўваць асаблівасці беларускай арфаэпіі (гучання).

Галоўны спецыяліст сектара картаграфіі Белдзяржкаммаёмасці Беларусі Наталля Аўраменка паведаміла, што новую інструкцыю стваралі на аснове беларускай лацінкі, распрацаванай Тарашкевічам. Паводле яе словаў, цяпер на міжнародных мапах не будзе больш назваў Byelorussia' ці Weisrussland, а толькі Belarus'.

**Паводле СМІ**

# Суседзі КАРАЛЕВА

У Вільню прыехала каралева. Тысячы беларусаў, якія з-за неспрыяльнае сітуацыі на Бацькаўшчыне сталі цяпер паводле пашпарту палякамі або літоўцамі, віталі манархіню з непадробным захапленнем. Усё ж такі сапраўдная каралева – гэта не які-небудзь прэзідэнт ці прэм'ер. Ад яе і не патрабуецца казаць палітычныя прамовы ці весці якія-небудзь важныя перамовы. Проста там, дзе яна з'яўляецца, усе адчуваюць, што ажыла казка, і што цуд гэтага жыцця нашмат большы за ўсе прамовы і перамовы. На шчасце, ёсць на планеце такія персанажы, як сапраўдная каралева. І на жаль, абмінаюць яны нашу краіну.

У Вільні каралева Вялікабрытаніі Лізавета II спаткалася з прэзідэнтам і соймам, усклала кветкі да магілы змагароў за незалежнасць Літвы, пагаварыла з людзьмі на плошчы, пабыла на лекцыі ва



ўніверсітэце і на банкеце ў гарадской ратушы. Цікава, што сярод гасцей 80-гадовай манархіні былі 10 раўналетак (каб было з кім перакінуцца словам), а ў прэзідэнцкім палацы яе ўпершыню сустракала варта ва ўніформе рыцараў 14-га стагоддзя. Да візіту каралевы гісторык Бумблаўскас падрыхтаваў яе генеалогію, скуль вынікае, што Лізавета II – далёкі нашчадак вялікага князя Гедыміна.

Пасля Вільні высокая госця разам з мужам, герцагам Эдынбурскім Пілiпам, адправілася ў Рыгу і Талін.

**Ул. інф.**

# ЧАРГА ДАЙШЛА ДА “АФГАНЦАЎ”

## “У ЧЫМ СІЛА, БРАТ? — СІЛА Ў ПРАЎДЗЕ”

кія ветэраны, якія дагэтуль лічыліся ледзьве не апораю сістэмы самога Лукашэнкі.

Перш, чым распавесці гэтую гісторыю, заўважу, што раздражняе правіцеля РБ не палітычная або рэлігійная ці нацыянальная арыентацыя чалавека і групы людзей, а менавіта здольнасць да самастойнага мыслення і самастойнага дзеяння. Хто не схільны згібацца, таго папросту ламаюць. Публіцы гэты працэс, як правіла, падабаецца, пакуль чарга не даходзіць да цябе канкрэтна. А калі такая чарга даходзіць – ты хоць гніся, хоць сцяліся, даломяць усё адно, і не будзе каму заступіцца. Да гонару ветэранаў афганскай вайны, яны ўсталі на абарону Паўла Красоўскага да таго, як рэпрэсіі праглынулі іх саміх.

Гаворка ідзе пра артыкул старшыні Таварыства інвалідаў вайны ў Афганістане, ардэнаносца Аляксандра Камароўскага, апублікаваны ў інтэрнэце на старонцы Belaruspartisan.org:

*“Апошнія месяцы для мяне і нашай арганізацыі – Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання інвалідаў вайны ў Афганістане – адметныя павышанай увагай да нас як з боку шараговых грамадзян, так і спецслужбаў.* – піша А.Камароўскі. *– Чым гэта выклікана? У першую чаргу з’яўленнем на Беларускім тэлебачанні яўна замоўленай і правакацыйнай перадачы нібыта пра падрыхтоўку маладзёвых тэрарыстаў сябрамі нашага аб’яднання”.*

**Абвінавачанні супраць Паўла Красоўскага – за леташнія выбухі ў Віцебску, а таксама за згвалтаванні і забойствы – ні што іншае, як спроба зламіць яшчэ адну групу беларускага грамадства, якая не надта ломіцца, а менавіта — ветэранаў афганскай вайны.**

Спадар Камароўскі распавядае, што за 20 гадоў дзейнасці афганскія ветэраны нямала займаліся з моладдзю, у тым ліку з цяжкімі падлеткамі з адной мэтай – адарваць юнакоў ад п’янства, наркаманіі, гультайства ды іншых негатыўных праяваў. Праз іх групы вайскова-спартовага кшталту прайшло больш за 10 тысяч маладых людзей. Ад дзяржавы на сваю выхаваўчую дзейнасць яны за гэты час не атрымалі ні капейкі. Між тым, дзяржава выхаваннем сур’ёзна не займаецца, у яе на першым месцы – выбары, рэферэндумы і ўсхваленне існуючага ладу, прэзідэнта і вертыкалі.

*“І вось напачатку жніўня 2006 году мы праводзілі адно такое выхаваўчае мерапрыемства з групай моладзі ў складзе 34 чалавек, сярод якіх былі і юнакі дэмакратычнай арыентацыі, якія знаходзяцца пад прыцэлам спецслужбаў”.*

Камароўскі добра ведае гэтых хлопцаў і абсалютна ўпэўнены, што менавіта такія падлеткі – надзея і будучыня беларускай дзяржавы.

*“У гэтую групу старэйшым мною быў прызначаны Павел Красоўскі, мой намеснік па працы з моладдзю... Але праз два дні на маладзёвы лагер... быў зроблены, скажу адкрытым тэкстам, паўбандыцкі напад міліцыі і спецслужбаў у колькасці 30 чалавек, хоць па добраму мог прыбыць адзін участковы інспектар і высвятліць усе пытанні. Але дзе там, была ж запланавана маштабная... правакацыя”.*

Арганізатараў лагера затрымалі.

*“За час паўтарагадзінавага допыту мне задавалі пытанні, якія абсалютна не тычацца справы.* – піша А.Камароўскі. — *Супрацоўнікаў міліцыі цікавілі мэты нашага лагера, якім чынам запрашаліся ў лагер людзі, хто выбіраў месца, хто адказваў за бяспеку, колькі людзей у лагеры размаўляла па-беларуску, ці была ў лагеры незарэгістраваная сімволіка, хто адказваў за прывоз людзей, ці павінны былі прыехаць у лагер замежныя грамадзяне”.*

Тое, што ветэранаў Афганістана, якія займаліся з маладымі людзьмі, афіцыйная прапаганда прыраўняла да тэрарыстаў, спадар Камароўскі лічыць маразмам і палітычнай шызафрэніяй:

*“У народзе, асабліва сярод малаінфармаванай часткі насельніцтва трэба падтрымліваць пачуццё небяспекі, маўляў, дзяржаве і “Вялікаму Прэзідэнту”, а гэта значыць, і ўсяму беларускаму сялянству, рабочаму, дробнаму і сярэдняму службоўцу, пагражаюць ворагі”.*

Такім чынам, абвінавачанні супраць Паўла Красоўскага – за леташнія выбухі ў Віцебску, а таксама за згвалтаванні і забойствы – ні што іншае, як спроба зламіць яшчэ адну групу беларускага грамадства, якая не надта ломіцца, а менавіта — ветэранаў афганскай вайны. А.Камароўскі параўноўвае гэтыя абвінавачанні са шпіянажам на карысць Японіі, за што ў 1937-м годзе быў расстраляны яго сваяк-лесаруб.

Напрыканцы свайго артыкула “афганец” Камароўскі паведамляе, што ўжо атрымаў пагрозы на свой адрас. Гэта змусіла яго нагадаць пра лёсы зніклых папярэднікаў — Ю.Захаранкі, В.Ганчара, Д.Завадскага і А.Красоўскага.

*“Мы лічым гэтую справу чыста палітычнай, г. зн. відавочнае жаданне ўладаў знішчыць у зародку саюз апазіцыйнай моладзі і вопытных воінаў у асобе нашага кантынгента. А тут яшчэ ў дадатак мы абвясцілі на з’ездзе 9 верасня 2006 году пра магчымасць аб’яднання з ліквідатарамі Чарнобыля і стварэнні агульнанацыянальнай партыі. З-за гэтага і пайшла ўся валтузня...”*

Што ні кажыце, а для такіх заяваў патрабуецца сёння асабістая мужнасць. І было б дзіўна, каб гэтае мужнасці мы не дачакаліся ад ветэранаў афганскае вайны. Выходзіць, мае рацыю герой нашага “Апытання тыдня” Барыс Пятровіч: кожны мусіць бараніць свой гонар сам. Вось чаму адказы на пытанне “Хто сёння бароніць гонар беларускай інтэлігенцыі?” у цэлым атрымаліся невыразнымі і неканкрэтнымі. Назаві мы прозвішчы такіх людзей, з чыёй дзейнасцю звязваем свае спадзяванні на будучыню, пра іх заўтра ж пакажуць “пяцімінутку нянавісці” на БТ. Бо людзі мужныя і самастойныя, якія бароняць гонар – свой і краіны – сённяшняй дзяржаве непатрэбныя. Рэжым выступае супраць любой альтэрнатывы сабе самому. А гэта называецца, словамі з іншага матэрыялу сённяшняй “Свабоды” – фідэлізацыяй улады. Гэта значыць, у Беларусі павінна быць, як на Кубе, дзе нават пасля сыходу Фідэля яшчэ доўга не знойдзецца каму праводзіць у краіне курс перамен.

**А.Уласаў**

# СМЕРЦЬ ФРАНКЕНШТЭЙНА

## СНД ПАСЛЯ ПЕРАНОСУ САМІТА ЯШЧЭ БОЛЬШ НАБЛІЗІЛАСЯ ДА СКОНУ

*Дзяржаўнае ўтварэнне пад назвай СНД ад самага пачатку нагадвала Франкенштэйна, змайстраванага, дзякуючы фантазіі навукоўца-вар'ята, з чалавечых трупаў.*

Мала хто з палітыкаў верыў у жыццяздольнасць незалежных дзяржаваў, што паўсталі на прасторах СССР, які спыніў сваё існаванне ў снежні 1991 году. Тады ўзнікла прапанова злучыцца хоць нейкім чынам, хоць дзеля чагосьці. Маўляў, створым Садружнасць незалежных дзяржаваў, а потым разбярэмся. Каб разабрацца, спатрэбілася больш за дзесяць гадоў.

Хоць ужо тады, у момант утварэння СНД, былі цвярозыя аналітыкі, якія прадказвалі новаму ўтварэнню кароткі век. Але ж колькі грошай было выдаткавана на розныя саміты і канферэнцыі, колькі пустых, нікому не патрэбных пагадненняў было падпісана за гэтыя гады. Аднак прыйшоў час прызнаць – СНД сканала.

Хай фармальна Садружнасць яшчэ існуе, але ніхто ўжо не гарантуе, што гэта працягнецца доўга.

Лідэры Казахстана і Расіі праігнаравалі чарговы саміт СНД, які павінен быў адбыцца ў Мінску ў кастрычніку. Яны дамовіліся паміж сабой перанесці саміт на канец лістапада, а можа – і на больш няпэўны тэрмін.

Паседжанне Савета міністраў замежных справаў краінаў СНД у Мінску ўвогуле нагадвала камедыю, паколькі толькі чатыры краіны – Беларусь, Расія, Казахстан і Таджыкістан былі прадстаўленыя на ўзроўні міністраў. Астатнія восем краінаў прыслалі ў Мінск альбо намеснікаў міністраў, альбо чыноўнікаў яшчэ ніжэйшага рангу. Якія важныя рашэнні маглі быць прынятыя на гэтулькі непрадстаўнічым пасяджэнні?

Ніхто, уласна кажучы, і не прэтэндаваў на лёсавызначальныя вынікі. Як піша расійская газета «Новые Известия», з дзевятнаццаці пытанняў, што былі на парадку дня, чатырнаццаць былі выкінутыя без абмеркавання як малазначныя. Так што, відавочна, ніхто з грамадзянаў краінаў-удзельніц СНД не адчуе ніякіх зменаў у сваім жыцці ад напружанай працы міністраў замежных справаў (ці іх намеснікаў) на "саміце" ў Мінску.

Што тычыцца пераносу сустрэчы кіраўнікоў дзяржаваў Садружнасці, дык чыноўнікі спісалі ўсе праблемы на "тэхнічныя моманты". Маўляў, Уладзімір Пуцін і прэзідэнт Казахстана, які зараз старшынюе ў СНД, Нурсултан Назарбаеў дамовіліся на пачатку кастрычніка аб пераносе саміта з-за… "непадрыхтаванасці парадку дня".

Але ёсць і больш падобныя на праўду гіпотэзы. Тыя ж «Новые Известия» пішуць, што «за пяць дзён да сустрэчы Пуціна і Назарбаева ва Ўральску, Лукашэнка на чарговай прэс-канферэнцыі абвінавацій Расію ў запавольванні тэмпаў стварэння саюзнай дзяржавы, а таксама ва ўсталяванні "небратэрскіх цэнаў" на газ для Беларусі". У перакладзе на мову рэальнай палітыкі гэтыя абвінавачанні азначалі наступнае. Беларусь, нягледзячы на ціск Расіі, не хоча за нішто аддаваць «Белтрансгаз» у рукі расійскага «Газпрома». Прычым, новыя расійскія цэны на газ Беларусь не палохаюць, паколькі Мінск, нібыта, дамовіўся з альтэрнатыўным пастаўнікам газу ў асобе прэзідэнта Венесуэлы Уга Чавеса. (Які, дарэчы, лічыцца таксама лепшым сябрам Расіі.)

Пачуўшы такое ад саюзніка, Масква прыйшла ў ярасць. І адмовай Пуціна ехаць у Мінск Лукашэнку, пасутнасці, далі шанец яшчэ раз узважыць свае заявы і ўспомніць, чыя негалосная падтрымка забяспечыла яму чарговы прэзідэнцкі тэрмін.

На карысць менавіта такога варыянту развіцця падзеяў ускосна гавораць і іншыя факты. Напрыклад, скандал, які адбыўся на семінары дэпутатаў Парламенцкага сходу "Саюзнай дзяржавы" Беларусі і Расіі ў Растовена-Доне. Там дэпутат Думы Анатоль Локцеў обнародаваў "сакрэтны ліст" за подпісам намесніка міністра эканамічнага развіцця і гандлю Расіі, накіраваны яшчэ ў ліпені ва ўсе суб'екты Федэрацыі. У дырэктыве на адрас рэгіянальнай адміністрацыі ёй прадпісвалася абмежаваць імпарт беларускіх тавараў.

Міністр замежных справаў Расіі Лаўроў у Мінску хоць і абверг гэтае паведамленне, але неяк не пераканаўча. Сказаў толькі, што яму асабіста нічога не вядома пра гэты дакумент, і што абмежаванне імпарту нанесла б шкоду беларуска-расійскім дачыненням. Ды хто б сумняваўся!

Праўда, перад гэтым было яшчэ паведамленне аб тым, што пастаўкі расійскай нафты праз трубапровад "Дружба" скараціліся на трацiну. Афіцыйная прычына – нейкія "працяканні" трубаправоду на тэрыторыі Беларусі.

Расія паводзіць сябе так, што ні аб якім раўнапраўным партнёрстве няма і гаворкі. Ды і астатнія сябры СНД паводзяць сябе адпаведна няпэўнаму статусу гэтай арганізацыі – кожны стараецца адхапіць для сябе кавалак пабалей, не зважаючы ні на якія забавязанні. Так што, якая можа быць дружба ў Садружнасці?…



*Ючанка тэлефануе Саакашвілі:*
*-- Вялікі дзякуй, Міхаіл!*
*-- За што?*
*-- Расія ў супрацьстаянні з Грузіяй так аслабела, што Ўкраіна хутка стане старэйшым братам.*

**http://www.eggs.net.ua**

Зразумела, СНД можа яшчэ праіснаваць не адзін год у каматозным стане – як той Франкенштэйн. Але ж карысці ад гэтага няма ніякай.

А вось кіроўцам аўто падчас сустрэчы міністраў гэтай арганізацыі ў Мінску давялося сутыкнуцца з рэальнай праблемай – увесь цэнтр быў перакрыты для руху. Так што "жывыя трупы" яшчэ і перашкаджаюць людзям жыць.

**Алег Ман**

"Саюздрук"

# "ДОБРАЯ АГАРОДЖА" НА ШЛЯХУ "ПАТОКУ НЕГАТЫЎНАЙ ІНФАРМАЦЫІ»

Нястомны выкрывальнік беларускай апазіцыі Яўген Росцікаў з «Рэспублікі» гэтым разам сваё пяро-дзіду накіраваў супраць адукацыйнай праграмы, дзякуючы якой дзясяткі беларускіх студэнтаў могуць цяпер атрымаць нармальную адукацыю на Захадзе.

*"Собственно, этот проект начал осуществляться еще в начале 90-х годов прошлого столетия. Цель его – прозападное обучение и воспитание молодых людей в духе неприятия (на том первом этапе) всего советского, а по прошествии времени – политического и социально-экономического курса, проводимого руководством республики.*

*После того как в июле 2004 г. в Минске был закрыт так называемый Европейский гуманитарный университет (ЕГУ), его тут же перебросили в Литву. В феврале 2006 г. он получил там официальный статус. Но еще в октябре прошлого года в этом вильнюсском ЕГУ к занятиям приступило более 500 представителей Беларуси. Сейчас число их выросло до 1500 человек.*

Цікава, што галоўную загану праграмы аўтар бачыць у "непрыняцці ўсяго савецкага". Дзякуй за шчырасць. Бо ў гэтым выпадку казаць пра непрынянцце "беларускага" не выпадае. Беларускага ў нашых ВНУ становіцца ўсё менш. У адрозненне ад таго ж ЕГУ. А тое, што колькасць студэнтаў узрасла ў тры разы, факт, сапраўды, не вельмі радасны. Чаму не ў дзесяць? Бо людзей, якія нарадзіліся не ў СССР, становіцца ўсё болей.

"Звязда", як важную і радасную падзею падае завяршэнне дэмаркацыі дзяржаўнай мяжы Беларусі з Латвіяй і Літвой.

*"Устаноўкай сімвалічнага памежнага знака ў Браслаўскім раёне фактычна завяршылася дэмаркацыя прыбалтыйскага ўчастка Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь. Месца выбрана невыпадкова. Менавіта тут, на Браслаўшчыне, сыходзяцца ў сімвалічным трохкутніку суседскія межы: Беларусі, Латвіі і Літвы. Ва ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным гэтай гістарычнай падзеі, узялі ўдзел не толькі госці з Літвы, Латвіі, але і прадстаўнікі іншых краін Еўрасаюза: Германіі, Вялікабрытаніі, Францыі. Старшыня Дзяржкамітэта пагранічных войскаў Беларусі Аляксандр Паўлоўскі адзначыў, што «на сёння з краін СНД толькі Беларусь правяла дэмаркацыю ўсіх межаў з Еўрапейскім саюзам». Праца гэтая, між іншым, даволі карпатлівая, бо працягласць з Літвой складае 680 кіламетраў, з Латвіяй — 170 кіламетраў. Адных толькі памежных слупоў было ўстаноўлена амаль 2,4 тысячы. Пасол Еўракамісіі ў Беларусі, Украіне і Малдове Ян Боуг перш за ўсё падкрэсліў, што «калі ў вас ёсць добрая агароджа, тады ў вас ёсць добрыя суседзі».*

Такія шчырыя словы з вуснаў еўрачыноўніка чуць асабліва прыемна. Трэба разумець, што добрая агароджа будуецца надоўга. Хоць тут інтарэсы Лукашэнкі супадаюць з Еўрасаюзаўскімі. Цікава, што яны там намалявалі, на тым сімвалічным знаку? Бо гэта ж будуецца мяжа паміж намі і цывілізаваным светам.

«Минский курьер» у духу савецкіх нататак пра "іх норавы", падае несуцяшальную для Захаду статыстыку.

*"Сегодня, по данным Всемирной организации здравоохранения, психическими заболеваниями страдают более 450 миллионов людей на планете. В западных странах каждый седьмой человек либо является параноиком/шизофреником, либо подвержен депрессиям и алкоголизму. Специалисты предсказывают, что к 2020 году психические расстройства войдут в мировую пятерку болезней-лидеров. Как остаться здоровым психически, не знает почти никто. Природа возникновения шизофрении, эпилепсии и депрессивного психоза остается для врачей загадкой. Но совершенно точно известны факторы, повышающие риск их развития: это постоянно растущее количество стрессовых ситуаций, неправильное питание, а также нескончаемый поток негативной информации".*

Калі мысліць лагічна, згодна з "МК" беларусам шызафрэнія пагражае ў найменшай ступені. Зважаючы на высілкі прэзідэнта, накіраваныя на тое, каб стрэсавых сітуацый у калгасах і працоўных калектывах увогуле не было. Кантракт на год, згодна з якім вас можна выкінуць на вуліцу, стрэсам не лічыцца. Ад патоку негатыўнай інфармацыі ў Беларусі грамадзяніна аберагуць не горш, чым у Пхеньяне. Таму шызафрэнікаў і параноікаў у нас найменш.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# ДАЙЦЕ ЖЫВУЮ ДЫСКУСІЮ
## АБО ЯК БЕЛАРУСКІЯ НАЗВЫ ПІСАЦЬ ЛАЦІНКАЙ

На мінулым тыдні адна з "Экспертызаў" Радыё Свабода была прысвечана тэме расколу ў апазіцыі. Да дыскусіі запрасілі спадароў Раманчука і Карніенку. Спадар Карніенка заявіў, што, мауляў, Мілінкевіч – выдатнае персанальнае ўвасабленне дэмакратычных сілаў. А спадар Раманчук сказаў, што нам не патрэбна ніякага персанальнага ўвасаблення. І тут я ўжо парадаваўся: ну, зараз будзе дыскусія! Але дыскусіі не атрымалася. Такое ўражанне, што спадары Карніенка і Раманчук і не сядзелі за адным сталом. Проста вядучы задаў ім паасобку пытанні, а потым іхнія адказы змантавалі разам. Так што я паўтару свой лозунг з мінулага агляду: свабоду слова апазіцыі! Дайце жывую дыскусію ў простым эфіры.

У панядзелак на Еўрапейскім Радыё перадалі навіну: нібыта прыехалі ў Беларусь эксперты ААН і Беларусь прапанавала ім пісаць беларускія назвы на картах беларускай лацінкай. Далей браліся інтэрвію ў паважаных спецыялістаў — Радзіма Гарэцкага і Пятра Садоўскага. Але пра лацінку нічога не гаварылася. Спадар Гарэцкі прапанаваў памяняць Мінск на Менск, а спадар Садоўскі сказаў, што не так важна, што немцы будуць называць Беларусь – Вайсрусланд. Тэма ж беларускай лацінкі – як яно будзе пісацца? – раскрыта не была.

Моўны прыклад зьвязаны з папярэдняй навіной. У адной з "Палітычных геаграфіяў" на Радыё Свабода карэспандэнт Віталь Сямашка рабіў рэпартаж з мястэчка ДубрАвы, а называў яго ўвесь час ДУбрава. Рэч у тым, што мясцовыя людзі кажуць ДубрАвы альбо ДубрАва. Ведаю, бо недалёка адтуль мая радзіма. Таму звяртаюся да карэспандэнтаў з просьбай: калі ласка, кажыце назвы ў мясцовым гучанні, бо толькі яны слушныя і толькі яны павінны замацоўвацца і шанавацца.

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# РБ КУБА

## САПРАЎДНАГА ДЫКТАТАРА НАРОД ЛЮБІЦЬ

Гадоў пяць-шэсць таму гасцявалі мы ў аднаго з дзеячоў апазіцыі. Па-змоўніцку падміргваючы, ён бадзёра пераконваў нас – не пройдзе і паўгода, як улада пяройдзе ў рукі бел-чырвона-белых, народ змяце ненавісны рэжым...

Мінае час, а не змяняецца нічога. І, бадай, трэба пагадзіцца з адным палітолагам, які пераканаы, што яшчэ гадоў 10-15 гэтай уладзе нічога не пагражае.

Стэрэатып – “дыктатар, якога ненавідзіць прыгнечаны ім народ” – памылковы. Бо сапраўднага дыктатара НАРОД ЛЮБІЦЬ! Як любіў Сталіна і Гітлера, як любіць цяпер Фідэля Кастра і Кім Чэн Іра.

Апазіцыя і “народ” гавораць на розных мовах – не толькі ў літаральным, лінгвістычным сэнсе.

Спакушаць цяперашні народ Пагоняю ды бел-чырвона-белым сцягам – усё роўна як агітаваць сярод механізатараў за новага старшыню, бо той, бач, запросіць у сельскі клуб Растраповіча і Мансерат Кабалье.

Нельга імкнуцца да таго, у чым не маеш патрэбы.

Еўропе цяжка зразумець – Беларусь сапраўды жыве цяпер лепш, чым у любыя раней...



***Скульптура Леніна** ў адным з рабочых кабінетаў. Мінская вобласць. Фота з архіва.*

нейшыя часы! Старэйшыя людзі добра памятаюць, як трэба было ісці ў краму па хлеб усёй сям’ёю, з малымі дзецьмі, бо давалі баханку хлеба “ў адны рукі”. Як па кілбасу трэба было ехаць ажно ў Вільню. Як працавалі за “трудодни” – пустыя палачкі, а ніякіх пенсій не было ўвогуле. А ў вяскоўцаў не было нават пашпартоў.

І цяперашняе жыццё, калі пенсію плацяць “воўрамя”, у краме разбягаюцца вочы ад тавараў, калі жук і жаба можа сабе прыдбаць “іншамарку”, якую ён раней бачыў толькі ў кіно – “чаво яшчо нада?” “Ізык біларускі? Зачэм?” А яшчэ танная гарэлка...

І калі б сапраўды цяпер адбыўся які дэмакратычны пераварот, і пачаўся непазбежны перыяд вэрхалу, міжпартыйнай грызні, дзяльбы маёмасці і зямлі, з банкруцтвам банкаў і фабрык... Лукашэнка з яго “стабільнасцю” стаўся б іконаю, святым народным заступнікам!

Прыгадваецца казачка пра ваўка і селяніна, які пераконваў шэрага госця, што перш чым хлеб есці, трэба ўзараць глебу, пасеяць зерне...

Вядомы літоўскі журналіст Альгімантас Чэкуоліс сумна прарочыў, што на Кубе і пасля Кастра доўга не будзе дабра. Камандантэ Фідэль за дзесяцігоддзі панавання так маральна згвалціў і разбэсціў свой народ, што перамены здзяйсняць проста няма каму.

Вось так і ў нас – кідаюць зерне сейбіты свабоды ад Каліноўскага да Быкава на неўзараную беларускую глебу, а нічога не прарастае.

І давядзецца гэтую глебу рыхтаваць доўга і цярпліва нам самім. Ніхто іншы, ніякія еўропы-амерыкі за нас гэтага не зробяць. Яны нашых заганаў не ведаюць.

Яны ўжо раілі нам зрабіць у краіне ільну джынсавую рэвалюцыю...

**Алег Аблажэй**

# ФОТАФАКТ




**Новыя правілы** *беларускай граматыкі?.. Здымак зроблены ў Магілёве, у кнігарні на рагу вуліц Міра і Першамайскай, кастрычнік, 2006*

# Невядомая Беларусь

**19 кастрычніка** 1831 году адбылася не вельмі прыкметная, на першы погляд, але важная для нашай гісторыі падзея. У гэты дзень у краіне было фактычна ліквідаванае сваё, беларускае дваранства — як сацыяльная сіла. Расійскі ўрад прыняў Закон пра аднадворцаў. Паводле яго ў катэгорыю аднадворцаў пераводзілася дробная шляхта, якая складала каля 10% насельніцтва краю. Закон быў помстай расійскай адміністрацыі за паўстанне 1831 году. Дробных дваран пазбавілі зямельнае ўласнасці і саслоўных адзнакаў. Такім чынам быў радыкальна зменены сацыяльны партрэт Беларусі – краіна пазбаўлялася сваёй эліты.

**20 кастрычніка** 1655 году ў мястэчку Кейданы падпісваецца міждзяржаўная дамова, якая замацавала саюз паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Шведскім Каралеўствам. Дамову падпісалі вялікі гетман Януш Радзівіл і шведскі кароль Карл Х Густаў. Цяпер войска нашых продкаў павінна было ваяваць разам са шведамі як супраць расійцаў, так і супраць палякаў. Аднак здзейсніцца гэтаму саюзу не выпала, бо супраць Януша Радзівіла ўзбунтавалася яго ўласнае войска.

**22 кастрычніка** 1937 году савецкія карныя органы расстралялі аднаго з найбольш таленавітых беларускіх пісьменнікаў даваеннае пары Лукаша Калюгу. Самыя вядомыя яго аповесці — “Ні госьць ні гаспадар” і “Нядоля Заблоцкіх”. Застаўся пасля Калюгі і недапісаны раман “Пустадомкі”.

**24 кастрычніка** 1654 году адбылася бітва пад Шапялевічамі – вызначальная ў часе нашэсця маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча на Беларусь. Як адзначае гісторык Г.Сагановіч, пасля паразы пад Шапялевічамі армія Вялікага Княства Літоўскага спыніла сваё існаванне. Маскоўскае нашэсце на тагачасную Беларусь будзе доўжыцца 13 гадоў і забярэ жыццё кожнага другога жыхара краю.

# ВІКА МАРОЗ ПАЧУВАЕЦЦА ДОБРА,

## БО ЯНА ЎПЭЎНЕНАЯ, ШТО ВЕРНЕЦЦА Ў ІТАЛІЮ

*Замежныя журналісты працягваюць сачыць за лёсам беларускай дзяўчынкі са школы-інтэрнату ў Вілейцы Вікі Мароз, якую хацела ўдачарыць сям'я з Італіі. Яна схавала дзяўчынку, баючыся, што па вяртанні на радзіму яе адправяць у нялюбы інтэрнат. Пад ціскам афіцыйнага Мінска італьянская паліцыя дэпартавала Віку ў Беларусь. Аб тым, што адбываецца зараз, распавяла нядаўна італьянская газета "Джорнале". Друкуем гэты аповед у скароце.*

"Хутка еду дадому, мне сказалі лекары. І ты, Саша, прыедзеш наведаць мяне ў Італію". Першыя праўдзівыя звесткі пра Марыю, маленькую беларускую дзяўчынку, вернутую спецрэйсам 29 верасня (паводле італьянскіх законаў у падобных сітуацыях нельга называць сапраўднае імя дзіцяці, таму італьянскія СМІ называюць Віку Мароз Марыяй. – заўвага перакладчыка), прыйшлі ад спецкарэспандэнта «Il Secolo XIX» («XIX Век», Генуя). Ён адшукаў дзіцячы дом, дзе знаходзіцца дзяўчынка, у Барысаве і сустрэўся з сям'ёй, якая прытуліла Сашу, ейнага брата... Дзяўчыне (пры размове з якой прысутнічала лекарка, агент КГБ), на самой справе, было сказана, што сям'я Джуста займаецца дакументамі аб яе ўдачарэнні. І, такім чынам, дзяўчынка толькі чакае моманту, каб сабраць свае няхітрыя рэчы і вярнуцца "да мамы з татам".

У сям'і Васілеўскіх, якая дае прытулак Сашы, ёсць двое дарослых дзяцей, і без сумнення, бацькі не змогуць узяць на сябе клопат аб Марыі, не маючы сур'ёзнай эканамічнай падтрымкі.

Выпадак з ёй працягваюць абмяркоўваць ў газетах і на Інтэрнэт-форумах. Людзі абмяркоўваюць будучыню дзяцей-сірот, якія жывуць у інтэрнатах. У той час як Лукашэнка прыпыняе паездкі сірот (выдаючы дазвол толькі тады, калі італьянскія сем'і пісьмова гарантуюць, што не збіраюцца іх усынаўляць) і прапануе падтрымку тым, хто ўсынаўляе дзяцей у Беларусі, ягоныя суайчыннікі, выглядае, не надта схільныя да гэтага.

«Дайце здаровага малога, найлепш – дзяўчынку-бландынку з блакітнымі вачыма, ва ўзросце меней за год", – просяць сямейныя пары ў чаканні ўсынаўлення, расказвае беларуская журналістка Людміла Габасава ("Советская Белоруссия"). Любоў італьянскіх сем'яў, якія прымаюць маленькіх беларусаў, не мае абмежаванняў ні паводле ўзросту, ні паводле стану здароўя. Як гаворыць беларускі псіхолаг Ларыса Сазановіч, што 15 гадоў жыве ў Італіі: "дзяцей з дзіцячых дамоў ніхто не хоча ў Беларусі". "На іх – кажа яна – глядзяць як на крыху разумова адсталых. Насамрэч, гэтыя дзеці адаптуюцца вельмі добра, калі прыязджаюць у Італію, і іх сустракаюць цяплом і ўвагай …"

Палітыка матэрыяльнага стымулявання сем'яў не дае вынікаў. Гэта пацвярджае артыкул, апублікаваны ў інтэрнэт-газеце "Салідарнасць" на сайце www.gazetaby.com пад назвай «Дзеці застаюца без бацькоў" . "Паводле афіцыйных звестак 2004 году, — піша газета, — замежнікі ўсынавілі 596 беларускіх дзяцей, беларускія сем'і — 365. Пасля прыняцця новага закона, у 2005-м, замежнікі змаглі ўсынавіць толькі двух дзяцей з Беларусі, а беларускія сем'і, нягледзячы на падтрымку, усынавілі толькі на трох дзяцей больш, як у 2004 годзе". "Гэта азначае, што для больш як 11 тысяч дзяцей, што чакаюць усынаўлення, маюць вельмі малыя шанцы", сцвярджаюць у кіраўніцтве Нацыянальнага цэнтру ўсынаўлення ў Мінску.

**Паводле «Il Giornale»**

**Ад рэдакцыі:** На гэтым тыдні ўвага міжнароднай прэсы нечакана засяродзілася на афрыканскай краіне Малаві. Знакамітая спявачка Мадонна вырашыла ўсынавіць дзіця з гэтай краіны. Малаві ўваходзіць у дзясятку найбяднейшых краінаў свету. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын там складае 38 год, жанчын – 40. Але раптам мясцовыя ўлады заявілі, што права на ўсынаўленне ў іх краіне мае толькі той, хто пражыў у Малаві не менш за паўтары гады... Таксама "праявілі клопат" пра дзяцей.

Дарэчы, Малаві кіруе пажыццёвы прэзідэнт Камузу Банда, якога падтрымлівае адзіная ў краіне партыя.

**МАТЭРЫЯЛЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ «СВАБОДА» ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ ТАКСАМА Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ**

**VILNIA.COM**

**ТУТ, У РАЗДЗЕЛЕ *"АРХІЎ"* ВЫ МОЖАЦЕ ТАКСАМА ЗНАЙСЦІ АПОШНІЯ НУМАРЫ НАШАЙ ГАЗЕТЫ Ў ФАРМАЦЕ PDF; ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ**

**"СВАБОДА" БУДЗЕ ЗА НАМІ!**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер"
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў